С. В. Старавойтава

# СІНТАКСІС

## ПРОСТЫ СКАЗ

ПРАКТЫКУМ



Магілёў 2016

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
«МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
імя А. А. КУЛЯШОВА»

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

С. В. Старавойтава

# СІНТАКСІС. ПРОСТЫ СКАЗ

Практыкум

Магілёў
МДУ імя А. А. Куляшова
2016

УДК 811.161.3'36(075.8)
ББК 81.411.3–22
С77

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета МДУ імя А. А. Куляшова*

Рэцэнзент
настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
*С. А. Дзянісава*

**Старавойтава, С. В.**
С77 Сінтаксіс. Просты сказ : практыкум / С. В. Старавойтава – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2016. – 44 с.
ISBN 978-985-568-219-7

Дадзены зборнік змяшчае тэставыя заданні па асобных тэмах раздзела «Сінтаксіс», узоры выканання заданняў, а таксама схемы і алгарытмы. Выданне прызначана для праверкі ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў і падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання. Адрасуецца вучням старшых класаў агульнаадукацыйных установ, навучэнцам каледжаў, абітурыентам.

**УДК 811.161.3'36(075.8)**
**ББК 81.411.3–22**

**ISBN 978-985-568-219-7**

© Старавойтава С. В., 2016
© МДУ імя А. А. Куляшова, 2016

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# АДАСОБЛЕНЫЯ АКАЛІЧНАСЦІ.
# ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ ПРЫ АДАСОБЛЕНЫХ АКАЛІЧНАСЦЯХ

## Акалічнасці, выражаныя <u>дзеепрыслоўным зваротам</u>

***Коска ставіцца:*** незалежна ад месца ў сказе: *Вербы, <u>захутаўшыся ў туман</u>, сумавалі па сонейку.*

***Коска не ставіцца:*** з'яўляецца ўстойлівым выразам: *Дзеці раслі <u>на лес гледзячы</u>.*

## Акалічнасці, выражаныя <u>адзіночнымі дзеепрыслоўямі</u>

***Коска ставіцца:***

у пачатку сказа, у сярэдзіне сказа (акрамя становішча пасля дзеяслова-выказніка): *Дарога, <u>пятляючы</u>, губляецца сярод поля.*

***Коска не ставіцца:***

1. стаіць пасля дзеяслова-выказніка, значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння: *Нельга чытаць <u>лежачы</u>.*

2. перад злучнікам і, які звязвае два дзеепрыслоўі: *<u>Смеючыся і жартуючы</u>, дзеці ішлі са школы.*

Часціцы ***толькі, нават*** <u>аддзяляюцца коскай разам з адасобленай акалічнасцю</u>: ***<u>Нават</u>*** *<u>пражыўшы ў горадзе некалькі год</u>, Андрэй не мог прывыкнуць да гарадской мітусні.*

Калі пры дзеепрыслоўі ці дзеепрыслоўным звароце ёсць злучнікі ***нібы, быццам, як быццам*** і інш., то <u>коска ставіцца перад злучнікамі</u>: *Качар, **<u>быццам</u>** <u>зразумеўшы сваё становішча</u>, паплыў да берага і схаваўся пад веццем гнуткага лазняку, што ляжала на ціхай вадзе.*

Выдзяляюцца коскамі <u>акалічнасці, выражаныя назоўнікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі</u> ***нягледзячы на, насуперак, у адпаведнасці з, са згоды*** і інш. са значэннем умовы, прычыны, уступкі, спосабу дзеяння: *<u>Насуперак прагнозам</u>, дажджу сёння не было.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Заданне 1

**Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

1. Паўзучая бярозка, учэпіста абкруціўшы бульбоўнік цяжка паддавалася рукам.
2. Салавей спяваў доўга, узнёсла, славячы вячэрнюю зару.
3. У купальскую ноч маміны песні гучалі, не сціхаючы.
4. Барыс маўчаў як мыла з'еўшы.
5. Заўважыўшы чалавека паблізу асіны, адразу ж прыляцелі старыя дзятлы і так раскрычаліся, што хоць вушы затыкай.

**Ход разважання:**

<u>1 сказ.</u> Акалічнасць выражана дзеепрыслоўным зваротам *учэпіста абкруціўшы бульбоўнік*, які стаіць у сярэдзіне сказа, таму з двух бакоў выдзяляецца коскамі. Знакі прыпынку пастаўлены няправільна.

<u>2 сказ.</u> Акалічнасць выражана дзеепрыслоўным зваротам *славячы вячэрнюю зару*, які стаіць у канцы сказа, таму аддзяляецца коскай. Знакі прыпынку пастаўлены правільна.

<u>3 сказ.</u> Акалічнасць выражана адзіночным дзеепрыслоўем *не сціхаючы*, якое стаіць у канцы сказа пасля дзеяслова-выказніка, таму коскай не аддзяляецца. Знакі прыпынку пастаўлены няправільна.

<u>4 сказ.</u> Акалічнасць выражана дзеепрыслоўным зваротам *як мыла з'еўшы*, які з'яўляецца ўстойлівым выразам (фразеалагізмам), таму коскай не аддзяляецца. Знакі прыпынка пастаўлены правільна.

<u>5 сказ.</u> Акалічнасць выражана дзеепрыслоўным зваротам *заўважыўшы чалавека паблізу асіны*, які стаіць у пачатку сказа, таму аддзяляецца коскай. Знакі прыпынку пастаўлены правільна.

**<u>Адказ:</u>** 2, 4, 5

## Заданне 2

**Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць коску: а) перад злучнікам *і*; б) пасля злучніка *і*; в) і перад злучнікам і і пасля яго; г) не ставіцца ні перад злучнікам *і*, ні пасля яго:**

1. Чалавек нацягнуў лейцы і скінуўшы з галавы капюшон плашча, павярнуўся да мяне.
2. Ён прывязаў анучку, абгорнутую вакол нажа касы і ўскінуўшы касу на плячо, паважна падаўся да сенажаці.
3. Выйшаўшы з хаты ў наўмысна распаленай злоснай рашучасці і грукнуўшы нават дзвярмі, Карызна перш-наперш суняўся і з палёгкаю ўздыхнуў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Усю ноч бушавала вада, усё больш і больш падмываючы берагі і расшыраючы сваё рэчышча.

5. Агледзеўся жораў, страсянуўся, расправіў крылы і прытанцоўваючы, зрабіў некалькі крокаў.

**Ход разважання:**

1 сказ. Акалічнасць выражана дзеепрыслоўным зваротам *скінуўшы з галавы капюшон плашча*, які стаіць у сярэдзіне сказа пасля злучніка *і*, таму з двух бакоў выдзяляецца коскамі. Злучнік *і* – адзіночны, звязвае аднародныя выказнікі *нацягнуў* і *павярнуўся*, таму перад злучнікам коска не ставіцца. Значыць, коску трэба паставіць пасля злучніка *і*.

2 сказ. Акалічнасць выражана дзеепрыслоўным зваротам *ускінуўшы касу на плячо*, які стаіць у сярэдзіне сказа пасля злучніка *і*, таму з двух бакоў выдзяляецца коскамі. Злучнік *і* звязвае аднародныя выказнікі *прывязаў* і *падаўся*. *Абгорнутую вакол нажа касы* – адасобленае азначэнне, выражанае дзеепрыметным зваротам, які стаіць пасля азначаемага слова *анучку*, таму з двух бакоў выдзяляецца коскамі. Значыць, коска ставіцца і перад злучнікам *і*, і пасля яго.

3 сказ. *Выйшаўшы з хаты ў наўмысна распаленай злоснай рашучасці і грукнуўшы нават дзвярмі* – аднародныя акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі зваротамі і звязаныя адзіночным злучнікам *і*, таму коска паміж імі не ставіцца.

4 сказ. Злучнік *і* звязвае дзве аднародныя акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі зваротамі, таму ні перад *і*, ні пасля *і* коска не ставіцца.

5 сказ. Акалічнасць выражана адзіночным дзеепрыслоўем *прытанцоўваючы*, якое з двух бакоў выдзяляецца коскамі. Злучнік *і* звязвае аднародныя выказнікі *расправіў* і *зрабіў*, таму перад ім коска не ставіцца.

**Адказ:** а) 1; б) 5 ; в) 2; г) 3, 4

**1. Адзначце сказы: а) з адасобленымі азначэннямі; б) з адасобленымі акалічнасцямі; в) з адасобленымі і азначэннямі, і акалічнасцямі:**

***Варыянт 1***

1. За імі пачыналіся маладыя сакавітыя баравіны, перамешаныя са старым лесам.

2. Мяккія белыя купіны, падобныя на вялізныя падушкі, былі раскіданы між хвойнічку.

3. Жытнёвыя хвалі збягалі з узгорка, набягалі адна на адну і, разбіваючыся ў нізіне, адступалі назад, заспакоеныя на нейкі момант.

4. Падыходзячы да дзялянкі, на якой гэтымі днямі засеялі проса, Леўка суняўся.

5. На палянцы, акружанай з усіх бакоў баравымі соснамі, стаяла леснічоўка.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Летам густая збажына ўсё цяпло забірала, не даючы кветкам падняць да сонца свае галоўкі.

2. А вада бурліць унізе, гамоніць, несучы вялізныя сосны і алешыны, вырваныя дзесьці з карэннем.

3. Выпаўзшы з возера, жукі некаторпы час нерухома сядзелі на цёплым пясочку, нагрэтым летнім сонцам.

4. Над гарамі ўспаўзла вялізная чорная хмара, засцілаючы бледна-цьмянае неба.

5. Хіба ўвосень не расцвітае яблынька, зведзеная ў зман здрадлівай ласкай бабінага лета?

**2. Адзначце сказы, у якіх адасобленая акалічнасць выражана дзеепрыслоўным зваротам:**

***Варыянт 1***

1. Жывучы сярод прыроды птушак і звяроў ляснік навучыўся іх добра разумець.
2. Дзеці сядзелі пад елкай сцішана ўглядаючыся ў хмызняк.
3. Калі дзятлаў доўга не было, малыя накрычаўшыся суцішваліся і выглядалі з дупла.
4. Днём ужо едучы на футбол я выскачыў з трамвая на плошчы.
5. Папалуднаваўшы яны маўкліва вырашылі, што гадзіну якую можна адпачыць.

***Варыянт 2***

1. Ведаючы асцярогу і недаверлівасць жаваранкаў я хуценька сфатаграфаваў гняздо з птушанятамі і пакінуў іх у спакоі.

2. Але гэта толькі здавалася так, што мы сваволячы не заўважалі сваіх крылатых суседзяў.

3. Стары ляснік запаволіў хаду нахіліўшыся падняў некалькі жалудоў, паклаў у кішэню.

4. Наведваючыся ў гэты барок Станіслаў браў з сабою свайго сына.

5. Па-рознаму Лемяшэвіч прыехаўшы ў Крыніцы знаёміўся з людзьмі.

**3. Адзначце сказы, у якіх акалічнасці трэба выдзеліць коскамі.**

***Варыянт 1***

1. Сасонкі добра прыжыліся і разрасліся ўзняўшыся пышнымі кронамі ў самае неба.

2. Раман пад паперамі падпісаўся не спяшаючыся.

3. Залачонымі пырскамі будзе ўзлятаць з-пад ног раса збітая з травы.

4. Сціхнуўшы на хвіліну вецер накідваецца на дрэвы з новай сілай.

5. З дупла даносяцца заглушаючы іншыя гукі і шолахі звонкія галасы дзятлікаў.

***Варыянт 2***

1. Каля разбуранага ваеннага акопа ў сасновым бары амаль на голым пяску прысыпаным ігліцай, расце шырокі малінавы куст.

2. Пасля апошняга пракосу хлопец у раку кінуўся не распранаючыся.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Адчуваючы стомленасць Любоў Захараўна ветліва папрасіла жанчыну крыху пасунуцца.

4. Некалькі хвілін праляжаў ён з адкрытымі вачыма углядаючыся ў цемру, потым паварушыўся і асцярожна пачаў мацаць вакол сябе рукамі.

5. Прыгледзеўшыся тут можна было знайсці цудоўныя белыя аркі, за якімі віднелася нешта чароўнае.

**4. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставіцца коска:**

***Варыянт 1***

1. Вавёркі спрытна зрываюць сухія шышкі ды_ спяшаючыся, нясуць у сваё дупло.
2. Падняўшы зранку звон_ і абудзіўшы ўсё вакол, на лузе ладна свішчуць косы.
3. Бабуля_ сагнуўшыся, ішла па баразне, ірвала траву і складвала ў фартух.
4. І тады_ хвалюючыся, баючыся адстаць ад дзядзькі Ігната, узмахнуў касой і я.
5. Міхась схлусіў_ не міргнуўшы вокам.

***Варыянт 2***

1. Мечык гаварыў_ патроху забываючы на няўдачу, патроху ажыўляючыся.
2. Я не магу_ рукі склаўшы сядзець.
3. Мележ любіў прыязджаць у Куранёўку, заходзіць да цёткі Ганны і_ сеўшы на прызбу ці лавачку, успамінаць тое, далёкае.
4. Праверыўшы паставых_ і пагутарыўшы з імі, камісар пайшоў назад у глыб лесу.
5. Праходзячы па вуліцы_ людзі часта бачылі ў акне гэтай хаты хлопчыка, бледнаватага, з глыбокімі чорнымі вочкамі.

**5. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску коска не ставіцца:**

***Варыянт 1***

1. Лемяшэвіч дапіў чай_ не спяшаючыся.
2. Лісце зрываецца з дрэў_ і, павольна кружачыся, кладзецца на зямлю.
3. Пагаварыўшы з вучнямі_ і крыху разагнаўшы іх страх, Лабановіч прыступіў да заняткаў.
4. Ручайкі спачатку ціха, а потым усё гучней і гучней пачынаюць звінець_ прабіваючы пад снегам дарогі ў лагчыны.
5. Той, хто ў густых маладых сасонніках ці ельніках_ збіраючы масляні і падасінавікі, рухаецца ціха і непрыкметна, не робіць рэзкіх рухаў, абавязкова ўбачыць малінавак.

***Варыянт 2***

1. Каля пабеленага хлеўчука ўзвышалася над усёй вёскай старая ліпа_ пакрываючы сваім ценем палавіну прасторнага двара.
2. Сонца засвеціць шчыра і ласкава, неба ачысціцца ад хмар_ здзівіўшы празрыстым паветрам.
3. Бацька пайшоў на працу_ не паснедаўшы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Куды гэта вы сабраліся_ на ноч гледзячы?

5. Вось адна з птушак схамянулася, пабегла па галінках на самую макаўку чырвонай рабіны_ і, узмахнуўшы крыльцамі, узляцела ў паветра.

**6. Адзначце сказы, у якіх пасля злучніка *і* трэба паставіць коску:**

***Варыянт 1***

1. Устрывожана пагойдваючы доўгім тоненькім хвастом і_ палахліва папіскваючы, птушка з недаверам глядзела на мяне.
2. Апошні ледавік адарваў валуны ад Скандынаўскіх гор і_ разлучыўшы з радзімаю, прынёс на нашу зямлю.
3. Паназіраўшы за чалавекам і_ пераканаўшыся, што нічога не пагражае, дзяцел наблізіўся да дупла.
4. Гаспадар кідаў у хату клубок нітак і_ ўзяўшыся за нітку, уваходзіў сам.
5. Ты помніш, дзе і пад якім дрэвам напаткаў кожны грыб і_ асцярожненька падрэзаўшы, паклаў у кошык.

***Варыянт 2***

1. Чалавек падымаецца з каменя і_ абапіраючыся на кіёк, крочыць у напрамку вішнякоў.
2. Вера падыходзіць да люстэрка і_ гледзячыся ў яго, распускае валасы.
3. Дзынкалі пчолы, прысядаючы і_ вагаючыся на буйных кветках канюшыны, хаваючыся ў венчыках танканогіх званочкаў.
4. Андрэй Васільевіч і Любоў Захараўна сядзелі ля акна і_ адчуваючы спакой прыроды, адпачывалі душой.
5. На адным канцы дугі стаялі кучаравыя хвоі, звесіўшы над вадою галіны і_ аплёўшы пясчаны бераг цэлаю сеткаю смалянога карэння.

**7. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Каб мяне не заўважылі, прыйшлося бегчы, прыгнуўшыся.
2. Чапляючыся крыллем за нізкія хмары, над самым Жыцькавам ляцелі ў вырай журавы.
3. Вецер , мусіць, недзе заблудзіўся ці, нагуляўшыся ўчора, стомлена заснуў дзе-небудзь у старой пушчы.
4. Пайшоў Амелька нос павесіўшы.
5. Пятро Захаравіч моцна пасябраваў з хлапчуком, і прыязджаючы, заўсёды браў яго з сабой.

***Варыянт 2***

1. Некаторыя, павер, інстытут кідаюць або вучацца спусціўшы рукавы.
2. Я палічыў птушак за драздоў, але прыгледзеўшыся ўважлівей, пазнаў лясных жаваранкаў.
3. У жніўні зернеўборачны канвеер дзейнічаў, не спыняючыся.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Аднойчы, прабіраючыся ў далёкую вёску на заходняй ускраіне пушчы, ён натрапіў на фашысцкую засаду.

5. Упёршыся нагамі ў рабрыну вялікай лодкі, стары павольна і няспынна разгойдваўся, рытмічна ўзмахваючы цяжкімі вёсламі.

**8. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:**

***Варыянт 1***

1. Лідачка ўвайшла ў хату, кінула паліто на матчыны рукі, а партфель з падручнікамі ў кут, і, не спяшаючыся, падышла да люстэрка.

2. Пан падлоўчы хадзіў перавальваючыся.

3. Адны толькі дружныя шпакі павыводзіўшы дзяцей, зляталіся ў велічэзныя гурты, ляталі над палямі, то збіваючыся ў густыя чорныя кучы, то рассыпаючыся ў паветры празрыстымі сеткамі.

4. Трымаючыся карэннем за зямлю, дрэўца вясной яшчэ жыло, летам і восенню ўжо толькі існавала, а наступнаю восенню пачало чэзнуць.

5. Сяргей знарок зайшоў у клас апошнім з хлопцаў спадзеючыся, што ўсе да гэтага часу разаб'юцца па парах.

***Варыянт 2***

1. Добрае тое дзіця, што пойдзе плачучы, а вернецца скачучы.

2. Потым, дачакаўшыся, пакуль пад нагамі збярэцца вада, зноў, паліваючы, церла зруб.

3. Свой першы верш Костусь чытаў, хвалюючыся.

4. Праз некалькі хвілін маці падала полудзень, але Лідачка пакаштавала, скрывілася і адсунуўшы ўбок талерку, пачала разглядаць малюнкі ў новым часопісе для жанчын.

5. Але ўбачыўшы чалавека за кустом арэшніку, які рос метры за два ад асіны, птушкі паступова разляцеліся.

**9. Адзначце сказы, у якіх коска ставіцца: а) перад злучнікам *і*;**
**б) пасля злучніка *і*; в) не ставіцца ні перад злучнікам, ні пасля яго:**

***Варыянт 1***

1. Прыпыняюся і п'ю гэты свежы мёд усімі грудзьмі, п'ю прагна, хмялеючы і забываючыся на ўсё.

2. Агледзеўся жораў, страсянуўся, расправіў крылы і прытанцоўваючы, зрабіў некалькі крокаў.

3. Вясковыя хлапчукі, што загаралі і купаліся на рэчцы, убачылі Мішу і умомант усхапіўшыся, абступілі яго.

4. З шумам сарваўся з высокай асіны глушэц, лопаючы цяжкімі крыламі і праляцеў над нашымі галовамі.

5. Зусім нечакана, як па камандзе, танцоры насталі, разабраўшыся парамі і занялі свае месцы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# АДАСОБЛЕНЫЯ АЗНАЧЭННІ. ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ ПРЫ АДАСОБЛЕНЫХ АЗНАЧЭННЯХ

1. Знайдзіце ў сказе азначэнне.
2. Знайдзіце слова, да якога адносіцца азначэнне, вызначце, якой часцінай мовы яно з'яўляецца:

| Займеннік | Назоўнік | | |
|---|---|---|---|
| **коска ставіцца незалежна ад месца ў сказе** | вызначце месца азначэння ў сказе | | |
| | *пасля назоўніка* | *перад назоўнікам* | |
| | **коска ставіцца** | **коска не ставіцца** | **коска ставіцца** |
| *Прыемна ўражаныя, мы ішлі дадому.* | *Кветкі, пасаджаныя мною, прыняліся* | *Намаляваны сынам малюнак быў прыгожы* | **1. Аддаленае ад паяснёнага слова**<br>*Купленыя сёння, ляжалі на стале газеты.*<br>***2. Маюць дадатковае акалічнаснае значэнне умовы, прычыны, часу, уступкі):***<br>*Пакрытыя тоўстым пластом снегу, галіны гнуліся да самай зямлі.* |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Заданне 1

**Адзначце сказы, у якіх азначэнні аддзяляюцца (выдзяляюцца) коскай (коскамі):**

1. Дзве кабеціны-паляшучкі ўбраныя па-святочнаму аб чымсьці гутараць, спаткаўшыся на сярэдзіне вуліцы.

2. Сонца яшчэ стаяла над галавою, калі хлопцы падышлі да сям-там забалочанага рачнымі затокамі берага.

3. Напалоханая сённяшнім здарэннем жанчына доўга не магла заснуць.

4. Пасаджаныя рукамі песняра абступілі домік дрэвы.

5. Некалькі крывых і вузкіх палявых дарог крыжуюцца тут.

**Ход разважання:**

<u>1 сказ.</u> Азначэнне выражана дзеепрыметным зваротам *убраныя па-святочнаму*, стаіць пасля азначаемага слова *кабеціны-паляшучкі*, таму з двух бакоў выдзяляецца коскамі.

<u>2 сказ.</u> Азначэнне выражана дзеепрыметным зваротам *сям-там забалочанага рачнымі затокамі*, стаіць перад азначаемым словам **берага**, таму коска не ставіцца.

<u>3 сказ.</u> Азначэнне выражана дзеепрыметным зваротам *напалоханая сённяшнім здарэннем*, стаіць перад азначаемым словам *жанчына*. Коска ставіцца, таму што дзеепрыметны зварот абазначае прычыну. Жанчына доўга не магла заснуць (чаму?), бо была напалохана сённяшнім здарэннем.

<u>4 сказ.</u> Азначэнне выражана дзеепрыметным зваротам *пасаджаныя рукамі песняра*, стаіць перад азначаемым словам *дрэвы*. Коска ставіцца, таму што паміж азначэннем і азначаемым словам стаіць выказнік *адступілі*.

<u>5 сказ.</u> Азначэнне выражана прыметнікамі *крывых і вузкіх*, стаіць перад азначаемым словам *дарог*, таму коска не ставіцца.

**<u>Адказ:</u>** 1, 3, 4

## Заданне 2

**Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

1. А над жытам шумелі меднастволыя сосны, і поўныя хараства, разам з жытнёвым морам яны стваралі чароўны пейзаж.

2. Праз навісь галін відаць, густа засеянае, поле.

3. Заўсёды сур'ёзны, хлопец сярод сваіх сяброў любіў пажартаваць.

4. Восенню ці вясною сувязь са светам перарывалася на цэлыя месяцы: багна, разбухлая ад слоты і разводдзя, моцна адразала востраў ад свету.

5. З паўночнага боку хвойнікаў і ў глыбокіх ірвах яшчэ ляжаў чорны снег, спрасаваны вятрамі, дзівосна парэзаны веснавымі раўчукамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Ход разважання:**

<u>1 сказ</u>. Злучнік і звязвае часткі складаназлучанага сказа, таму перад ім ставіцца коска. Азначэнне *поўныя хараства* выражана прыметным зваротам, адносіцца да займенніка *яны*, таму з двух бакоў выдзяляецца коскамі. Знакі прыпынку пастаўлены няправільна, так як пасля злучніка *і* коска не стаіць

<u>2 сказ.</u> Азначэнне выражана дзеепрыметным зваротам *густа засеянае*, стаіць перад азначаемым словам *поле*, таму коска не ставіцца. Знакі прыпынку пастаўлены няправільна.

<u>3 сказ</u>. Азначэнне выражана прыметным зваротам *заўсёды сур'езны*, стаіць перад азначаемым словам *хлопец*. Коска пастаўлена правільна, таму што азначэнне мае <u>значэнне ўступкі</u>: *Хлопец сярод сваіх сяброў любіў пажартаваць (нягледзячы на што?), нягледзячы на тое, што заўсёды сур'ёзны.*

<u>4 сказ.</u> Азначэнне выражана дзеепрыметным зваротам *разбухлая ад слоты і разводдзя*, стаіць пасля азначаемага слова *багна*, таму азначэнне трэба выдзеліць з абодвух бакоў коскамі. Знакі прыпынку пастаўлены правільна.

<u>5 сказ.</u> Азначэнні выражаны дзеепрыметнымі зваротамі *спрасаваны вятрамі, дзівосна парэзаны веснавымі раўчукамі*, стаяць пасля азначаемага слова ***снег*** і з'яўляюцца аднароднымі. Таму знакі прыпынку пастаўлены правільна.

**<u>Адказ:</u>** 3, 4, 5

**1. Адзначце сказы, у якіх азначэнні трэба выдзеліць коскамі:**

***Варыянт 1***

1. З пясчанага і неглыбокага дна возера выпаўзалі на бераг дзіўныя, зеленаватага колеру істоты падобныя на вадзяных жукоў.
2. Абсыпаныя снегам галіны нізка схіліліся да самай зямлі.
3. Магутны прыгожы лось раскінуўшы вялізныя рогі выйшаў на прагулку.
4. Падаюць з неба белыя пушынкі ўсцілаючы зямлю мяккім снежным покрывам.

Адступалі балоты і на заходнім баку, дзе рунелі ці жаўцелі ад краю лесу палі скупыя няўдзячныя.

***Варыянт 2***

1. Белыя маланкі ўзразаючы цяжкую муць хмары ўспыхвалі раз-пораз.
2. З двара ў акно пазірала чорная ноч і завешанае густымі хмарамі-валокнамі цёмнае неба.
3. Вакол вогнішча стаіць начны змрок густы, душны.
4. Да дошкі прыбітай да апошняга вянца зруба і мокрай ад вады паналіпалі белыя парашуцікі з цёмна-карычневымі крапінкамі зярнятак.
5. Млосна пагойдваўся пад цёплым ветрыкам малады алешнік густа заплецены бела-зялёным хмелем.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**2. Адзначце сказы, у якіх прапушчаны знакі прыпынку:**

***Варыянт 1***

1. Адна стракозка, абцяжараная кропелькамі расы ледзь-ледзь даляцела да альховага куста, што стаяў над возерам, і прысела на яго лісцік.
2. Мне штосьці падабалася на яе твары адкрытым і вясёлым.
3. Пачаўся высланы мяккай ігліцай і парослы густой папараццю меднаствольны бор.
4. Напалову схаваны пад вадой ён ціха пагойдваўся на хвалях.
5. Маўчаць табой пасаджаныя клёны.

***Варыянт 2***

1. Не надта ўезджаная дарога вужакай вілася паміж укрытага інеем арэшніку.
2. Стаяла высокая, пасівелая ад туману і густой расы трава.
3. Маладыя, поўныя надзей, з неадольнай прагай жыцця мы не баяліся ніякіх цяжкасцей.
4. Неўзабаве луг уквеціўся людскімі постацямі і пракосы роўныя, шырокія, ляглі ўпоперак яго.
5. Пясчаны шлях, насыпаны ўзбоч чыгункі вядзе ў лес і ў мястэчка.

**3. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставяцца коскі:**

***Варыянт 1***

1. Атуленае садамі і прысадамі_ мястэчка ўяўляецца зялёным востравам сярод залацістага збожжавага разліву.
2. У вузкай гарлавіне_ сціснутай высокімі абрывістымі берагамі_ стаялі старыя дубы.
3. На тым беразе Дзвіны імчаліся грузавыя машыны_ па размяклым ад спякоты_ асфальце, і толькі рэха даносіла запозненыя гукі.
4. У блакітнай сукенцы, з чырвонай стужкай у кучаравых валасах, чысценькая і беленькая_ яна нагадвала прыгожую ляльку.
5. Дзядзька асцярожна паклаў касу на шызую, набрынялую холадам_ елачку.

***Варыянт 2***

1. Наваколле нібы занямела_ зачараванае цудоўнымі тонамі песні жаваранка.
2. За паваротам машына спынілася перад_ ярка асветленай_ хатай з верандай.
3. Зрэдку сустракаліся нізкарослыя дубкі, кучаравілася шыпшына_ расшытая аранжавымі ягадамі.
4. На Палессе хутка насоўвалася_ зацятая ў сваёй маўклівасці_ ноч.
5. Над кубкам возера_ глыбокім і шкляным_ лілеі плавалі ў хвалях сініх.

**4. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў коскі не ставяцца:**

***Варыянт 1***

1. Пакуль сонца ў тумане, сабраная ў кроплі раса_ трымаецца на траве.
2. У канцы лета ў зайчыхі нарадзіліся чацвёра зайчанят_ падобных да шэрых мяккіх клубочкаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Пясчаны шлях_ насыпаны ўзбоч чыгункі_ вядзе ў лес і ў мястэчка.

4. Яркае сонца аблівае твар зямлі_ мяккім цёплым _святлом.

5. Ён азірнуўся, акінуў позіркам даволі вялікае, акружанае з усіх бакоў лесам_ балота.

***Варыянт 2***

1. Прыгожы быў_ поўны сілы і невыказнай велічы_ палёт гэтай птушкі.

2. Вялікі, белы, ясны_ месяц над цёплым узбярэжжам усплыў.

3. Купчастая, разгалістая_ яна (сасна) мала падобная да гонкіх сваіх сясцёр дзе-небудзь у бары.

4. Неба_ спакойнае, лагоднае_ свяцілася яркімі зорамі.

5. Усё жывое вяла, нікла пад гарачым дыханнем_ нямоцнага, сухога і вельмі калючага_ ветру.

**5.Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Сцяпан з павагай зірнуў на старэйшага сына худзенькага, шчупленькага, які разважаў так па-даросламу.

2. Звычайна старанны, працавіты Максім не вельмі адказна паставіўся да вырабу дадзенага заказу.

3. Адтуль нясе густым водарам, сатканым з пахаў хвоі, прэлай зямлі, грыбоў і багуну.

4. Каля гэтага свяшчэннага дрэва, апавітага любоўю і пашанай, выконваліся найважнейшыя каляндарныя і сямейныя абрады.

5. У левай руцэ матлялася на ветры карычневая сумка, старая, але акуратная.

***Варыянт 2***

1. Адразу за вёскай пачыналася жоўтае ад іржышча, поле.

2. Цёпла апранутыя, яны весела шумелі і не баяліся холаду.

3. Надвячоркам пайшоў дождж па-майску цёплы, дробны, але спорны.

4. Млосна пагойдваўся пад цёплым ветрыкам малады алешнік, густа заплецены бела-зялёным хмелем.

5. Павуцінка, мокрая ад ранішняга туману, перапляла ўсе сцяжынкі, і падумалася, што прабег тут ноччу сярдзіты паранены звер і ўсюды пакінуў шматкі сваёй белай поўсці.

**6. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:**

***Варыянт 1***

1. Зямля, улагоджаная і сагрэтая яго ласкай адказвае хмельным буяннем жыцця.

2. Узрадаваная запрашэннем Валя ўвесь дзень была ў добрым настроі.

3. У радасным здзіўленні сустракаў лес бадзёры і ўмыты, першае праменне сонца.

4. На званках зарніц, што не хацелі расчыняць свае чырвоныя зеўранкі, гулі чмялі, апяразаныя чырвонымі і жоўтымі паяскамі.

5. Вылізаныя ветрам цьмяна блішчэлі заледзянелыя лужы на вуліцы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Адзінокі і горды, змагаецца ручай з маразамі.

2. Можна было ўбачыць тут ялінкі, падобныя да казачных снягурачак у белых кажушках і шапачках.

3. Перад хатай не было кветніка, а раслі два маладыя, як браты падобныя адзін да аднаго, клёны з выглянцаванымі камлямі.

4. Адарваная ад размовы з суседкай наперадзе жанчына злосна зірнула на Любоў Захараўну.

5. У вячэрнім паветры, крыху вільготным ад блізкай ракі прыемна пахне шыпшынай.

**7. Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі:**

***Варыянт 1***

1. Творчасць Івана Мележа, народнага пісьменніка БССР, з'яўляецца духоўным набыткам нашага народа.

2. Вецер зусім сціх, а з-за лесу пачала выпаўзаць шэра-сіняя хмара, акаймаваная залатым абадком чэрвеньскага сонца.

3. Тонкі назіральнік, ён разумее, ад чаго гучна застагнала старая хваіна і чаму схіліліся галінкі стромкай яліны.

4. Начны туман, чапляючыся за пушыстыя елкі, ціха спаўзаў на зямлю.

5. Мне здаецца, што зямлю нашу, Беларусь, можна назваць зямлёю пад белымі крыламі.

***Варыянт 2***

1. У гняздзе ўжо былі птушаняты, пакрытыя рэдкім пушком.

2. Бацьку яе, палкоўніка, паранілі на фінскай вайне, і ён прыехаў жыць у нашу ціхую малінаўку.

3. Краса тайгі, шыпшыннік дзікі, пялёсткамі ўсцілае дол.

4. Дрыжаць ад ветру на лугах пралескі – першая ўцеха вясны.

5. Па зямлі імкліва пакаціліся, абганяючы адна адну, сасновыя шышкі.

**8. Адзначце сказы, у якіх прыдатак трэба выдзеліць коскамі:**

***Варыянт 1***

1. Наш вялікі асветнік і гуманіст Сімяон Полацкі быў настаўнікам дзяцей царскага роду.

2. Крыж Ефрасінні Полацкай цуд ювелірнага мастацтва зроблены Лазарам Богшам.

3. Прыходзілі мары аб сваім дамку, перад якім будзе бела-ружовы сад поўны ўвосень сакаўных яблыкаў.

4. Каралева Бана жонка Жыгімонта была вельмі адукаванай жанчынай.

5. Яны сведкі майго маленства заўсёды клікалі мяне да сябе гуляць у ваўкоў і паляўнічага і цяпер вартуюць мой кожны крок, калі я іду з адходу ці падаюся ў лес.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Мы шасцёра, хто прыйшоў з вайны і застаўся жывы помнім Вераніку.

2. Насупраць за сталом сядзела яго жонка Ганна Грыгор'еўна баючыся падняць вочы на каго-небудзь з маладых людзей.

3. Выдатны паэт і крытык Максім Багдановіч вылучаўся глыбокай і шырокай адукацыяй.

4. На зямлі раскінуўся найпрыгажэйшы дыван вытканы рукою дзівоснага мастака.

5. Летнімі ціхімі вечарамі буслы закідваючы ўгору галаву клекаталі і клекаталі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА.
## ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ ПРЫ АДНАРОДНЫХ ЧЛЕНАХ СКАЗА

1. Вызначаем, як звязаны паміж сабой аднародныя члены сказа:

| Бяззлучнікавай сувяззю | Пры дапамозе супраціўных злучнікаў (а, але, аднак, затое) | Паўторнымі і парнымі злучнікамі | Злучнікамі **і, ці, або** | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Злучнік адзіночны | Злучнік паўторны |
| <u>коска ставіцца</u> | <u>коска ставіцца</u> | коска <u>ставіцца перад 2-ой часткай</u> | коска не ставіцца | [ і О, і О, і О ]<br>[О ,і О, і О] |

## ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ ПРЫ АДНАРОДНЫХ ЧЛЕНАХ СКАЗА З АБАГУЛЬНЯЛЬНЫМІ СЛОВАМІ

1. ***Аб. сл.: О, О, О.***
2. ***О, О, О – аб. сл.***
3. ***Аб. сл.: О, О, О – ... .***

### Заданне 1

**Адзначце сказы з прапушчанымі знакамі прыпынку:**

1. І ласі і зайцы звычайна не начуюць на адным і тым жа месцы.
2. Нас пачыналі хваляваць зорныя майскія вечары, прыцішаны шэпт на лавачках у сквeрыку і задуменныя пералівы гармоніка дзе-небудзь на ціхай вуліцы.
3. Не вабілі вока блізкія і далёкія сялянскія сядзібы, параскіданыя па заснежаных прасторах палёў то хутаркамі то невялічкімі вёсачкамі.
4. Ногі спатыкаліся аб пні і карэнне.
5. Вужа шмат хто асцерагаецца або проста баіцца.

### Ход разважання:

<u>1 сказ.</u> Аднародныя члены сказа *ласі* і *зайцы* звязаны паўторным злучнікам ***і***. Перад другім злучнікам трэба паставіць коску.

<u>2 сказ.</u> Аднародныя члены сказа *вечары*, *шэпт* звязаны бяззлучнікавай сувяззю, паміж імі стаіць коска. Аднародны член сказа *пералівы* звязаны адзіночным злучнікам ***і***, таму коска не ставіцца. Прапушчаных знакаў прыпынку няма.

<u>3 сказ.</u> Аднародныя члены сказа *хутаркамі* і *вёсачкамі* звязаны паўторнымі злучнікамі *то*. Перад другім злучнікам трэба паставіць коску.

<u>4 сказ.</u> Аднародныя члены сказа *пні* і *карэнне* звязаны адзіночным злучнікам ***і***, таму паміж імі коска не ставіцца. Прапушчаных знакаў прыпынку няма.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

<u>5 сказ.</u> Аднародныя члены сказа ***асцерагаецца*** і ***баіцца*** звязаны адзіночным злучнікам ***або***, таму коска не ставіцца. Прапушчаных знакаў прыпынку няма.

**<u>Адказ:</u>** 1, 3

**Заданне 2**

**Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць: а) працяжнік; б) двукроп'е; в) працяжнік і двукроп'е:**

1. Тут водзяцца самыя разнастайныя насельнікі лось, казуля, куніца, рысь і іншыя.
2. Па звычцы мець пры сабе ўсё гайкі, шурупы, пракладкі і іншыя дробныя дэталі ён і лісток дубовы машынальна паклаў у кішэню.
3. Ужо каторы дзень на лузе працавалі людзі касілі, варочалі ўжо падсохлую траву, зграбалі.
4. У лесе, у полі, на лузе ўсюды можна было пачуць галасы птушак.
5. Летам жабы забаўляліся ныралі, куляліся, дражнілі лянівых карасёў і ракаў.

**Ход разважання:**

<u>1 сказ.</u> Абагульняльнае слова *насельнікі* стаіць перад аднароднымі членамі сказа, таму пасля яго ставіцца двукроп'е.

<u>2 сказ.</u> Абагульняльнае слова *ўсё* стаіць перад аднароднымі членамі сказа, таму пасля яго ставіцца двукроп'е. Пасля аднародных членаў сказа *гайкі, шурупы, пракладкі і іншыя дробныя дэталі* сказ працягваецца, таму пасля іх ставіцца працяжнік.

<u>3 сказ.</u> Абагульняльнае слова *працавалі* стаіць перад аднароднымі членамі сказа, таму пасля яго ставіцца двукроп'е.

<u>4 сказ.</u> Абагульняльнае слова *ўсюды* стаіць пасля аднародных членаў сказа, таму перад ім ставіцца працяжнік.

<u>5 сказ.</u> Абагульняльнае слова *забаўляліся* стаіць перад аднароднымі членамі сказа, таму пасля яго ставіцца двукроп'е.

**<u>Адказ:</u>** а) 4; б) 1, 3, 5; в) 2.

**1. Адзначыць сказы з аднароднымі дзейнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Аслаблае лісце зрываецца з дрэў і, павольна кружачыся, бясшумна кладзецца на зямлю.
2. Даверліва цягнуліся да цёплых промняў набрынялыя вільгаццю травы, кветкі, лістота дрэў.
3. Мелодыя спеваў надзвычайна багатая, разнастайная, дзівосна прыгожая.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. На белым свеце мноства таямніц і загадак.

5. Тут знаходзяцца і развілка, і скрыжаванне.

***Варыянт 2***

1. Незвычайнага росквіту дасягнулі скамароства, школьны тэатр, батлейка.

2. Высока паднятая галава дуба, бязмерна тоўсты камель казалі пра тое, што ён быў найбольш разважлівы сярод усіх тутэйшых дубоў.

3. Прыгадаліся і дарога, і фурман дзядзька Кудрык, і шалёная завея, калі вецер злосна біў аканіцамі ў сцены.

4. Толькі пасля бярозавага гаю ён вывеў мяне на сцежкі, потым да калодзежа.

5. Кусты арэшніку, рабіны, чаромхі густа разрасліся ўнізе і далёка параскідалі свае зялёныя галіны.

**2. Адзначце сказы з аднароднымі выказнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Трэлі ліліся звонкія, адборныя, густыя.

2. Восень – гэта ростані на вечных дарогах старога і новага жыцця.

3. Адна з птушак схамянулася, пабегла па галінках на самую макаўку чырвонай рабіны і ўзляцела ў паветра.

4. Матылёк быў вялікі, прыгожы.

5. Раса холадна і неяк няветліва паблісквала ў лісці малачаю.

***Варыянт 2***

1. Ужо ні ў кога не заставалася сумнення, што і сёння навальніца абрынецца на вёску шквалам вады і маланак.

2. Здаецца, вавёрка адчувала сябе тут гаспадыняй, запрашала смялей трымацца.

3. Лес – жывая вопратка зямлі, яе музыка.

4. Калодзеж быў неглыбокі, дагледжаны, з пясчаным дном.

5. Заставаліся тут і біклажка, і каса, і латаная світка.

**3. Адзначыць сказы з аднароднымі азначэннямі:**

***Варыянт 1***

1. Ручай быў чысты, гаманлівы і вясёлы.

2. Лес закалыхвае аднастайным, мякка-лагодным шэптам.

3. Жыццё ў гэту пару не замірае, а нараджаецца.

4. Яна скочыла на самую нізкую ад зямлі галінку, пакруцілася на ёй, піскнула і зляцела на зямлю.

5. Не было каля млына ні людзей, ні фурманак.

***Варыянт 2***

1. Вольна паліўся мужчынскі голас, журботны і адначасова нейкі суровы.

2. Навокал было так згодна, хораша і радасна.

3. Ранішняе ліпеньскае сонца мяккімі хвалямі кацілася на надрэчную вёску, хвалі збягалі да вады і збіраліся ў рачным люстры, сляпілі вочы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Вада ў ручайку празрыстая, халодная.

5. Так легка і хараша, спраўна і проста ідуць у пракосе сапраўдныя касцы.

**4. Адзначыць сказы з аднароднымі акалічнасцямі:**

***Варыянт 1***

1. Цяжка і самавіта пратупаў у гушчар воўк.
2. Стары лес, што стаяў за рэчкаю, пазіраў важна і лагодна, нібы гаспадар на багацце сваіх ніў.
3. І мінулым, і сённяшнім днём мястэчка для мяне самае ўтульнае.
4. Але і сойку, і мяне чакала расчараванне.
5. Адзін такі сон паўтараецца ў мяне не раз і не два.

***Варыянт 2***

1. Вавёрка трымалася велічна, грацыёзна.
2. Сляды гэтага жыцця можна было бачыць і тут і там.
3. Вочы пільна і прагна сачылі за кожным рухам страшнага звера.
4. Сойка належыць да чорнай птушынай сям'і, куды залічаны таксама крумкач, варона, галка, грак і сарока.
5. Суніцы, чарніцы ўжо паспелі.

**5. Адзначыць сказы з аднароднымі дапаўненнямі:**

***Варыянт 1***

1. Жыццё стаіць перад пачаткам новага, яшчэ шырэйшага круга.
2. Кожны дзень адкрываў позірку, слыху штосьці новае.
3. Кожная дзялянка несла свае пахі, свой настрой, розны кожнага новага дня.
4. Наша Брэстчына мае багатую прыроду і слаўную гісторыю.
5. А над лесам ды над полем плывуць шляхам гусі.

***Варыянт 2***

1. Паветра было чыстае і празрыстае, але халоднае.
2. Ва ўсім наваколлі адчувалася нейкая насцярога, якая перадавалася і людзям, і жывёлам, і птушкам.
3. Снуючыся высока ў небе, раняла птушка мяккія, ласкавыя мелодыі.
4. Вецер прынёс мяккую цеплыню і веліч забытых за зіму пахаў.
5. Як чароўны ключ, адкрывае нам роднае слова разнастайныя цуды і таямніцы жыцця.

**6. Адзначце сказы з двума радамі аднародных членаў сказа:**

***Варыянт 1***

1. Сосны-прыгажуні гойдаліся ад ветру, рыпелі ласкава і аднастайна.
2. Высока ў сінім небе плыве яркае сонца, шчодра лье на зямлю сваю цеплыню і святло.
3. Корміцца вуж слімакамі, жабамі, жукамі, птушынымі яйкамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Колас уладжваўся з сям'ёй у сялянскай хаце і праводзіў лета сярод лясоў, палёў, лугоў.

5. Раскідвалі густалістае веццe магутныя ліпы, клёны, вязы.

***Варыянт 2***

1. У галодную пару кусцікі чарнічніку служаць кормам для ласёў, аленяў і казуль.

2. Белае маўчанне лесу, холад і голад абудзілі ў звера дзікі страх.

3. Найбольш моцныя і выразныя яго гукі далятаді ў бліндаж і перашкаджалі сну байцоў.

4. Часам ручай знікаў з поля зроку, хаваўся то ў траве, то ў хмызняку.

5. Усе птушкі з наваколля ведалі крынічку з гаючай вадой і, мабыць, часта прылятаді сюды палячыцца ад сваіх хвароб або адпачыць у цяньку ці пакупацца ў ручаі.

**7. Адзначце сказы, у якіх аднародныя члены сказа звязаны бяззлучнікавай сувяззю:**

***Варыянт 1***

1. Яны былі сатканы са звону срэбраных струн, з булькання лясных ручайкоў, з шолаху красак.

2. Дарога то падымалася на ўзгоркі, то спускалася ў лагчыны, разгортваючы ўсё новыя і новыя малюнкі.

3. З куста ядлоўцу адарваліся дзве шаўкавіста-срэбныя павуцінкі, паплылі да чародкі бярозак.

4. Былі ў нас свае авіятары, артылерысты, камандзіры, маракі, нават ваенны ўрач.

5. Расло ваверчанё не па днях, а па гадзінах.

***Варыянт 2***

1. Усіх хлопцаў на трэці дзень вайны выклікалі ў ваенкамат і загадалі быць вечарам на станцыі.

2. Францыск Скарына працаваў лекарам, удзельнічаў у складанні законаў дзяржавы.

3. Танцы, песні, гульні, святочная варажба прыносяць задавальненне людзям.

4. Лес заўсёды цёмны, спакойны, велічны, нават суровы.

5. Клапатлівая маці прыносіла малым то жабу, то мыш.

**8. Адзначце сказы, у якіх аднародныя члены сказа звязаны спалучальнымі злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Калёсы спыняліся яшчэ разы тры, і кожны раз то маці, то брат загадвалі вярнуцца.

2. Яму прырода таксама не пашкадавала ні прыгажосці, ні розуму, ні сілы.

3. Не пракосы, а палосы выжынае гладка сталь.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Яны, відаць, загінулі або ад куль фашысцкіх салдат, або ў час франтавых баёў.
5. Тут былі і цікаўнасць, і здзіўленне, і смех, і слёзы.

***Варыянт 2***

1. Гэта была ўжо не звычайная радасць прафесіянала, а нешта невымерна большае.
2. Не было ўжо ні руні, ні жаўранкаў над ёю, ні сонца.
3. Вецер прабіваўся праз вокны і сцены і разгульваў па пакоях вольны, як гаспадар.
4. Над лесам да над полем плывуць шляхам гусі.
5. Тата насіў Ліду на руках, падкідаў угору, гойдаў на каленях, і яна часта засынала, прытуліўшыся да яго грудзей.

**9. Адзначце сказы, у якіх аднародныя члены сказа звязаны супраціўнымі злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Восенню ці вясною сувязь са светам перарывалася на цэлыя месяцы.
2. Спрабавала птушка ўзляцець, ды зноў падала на зямлю.
3. Чэрвеньскае сонца золатам залівала вуліцу, было цёпла, але не горача.
4. У наш час каля некаторых буйных гарадоў не знойдзеш ні сон-травы, ні пралесак.
5. Сонца цяпер толькі грэе, але не пячэ, як у ліпені.

***Варыянт 2***

1. Як ні стараліся хлопцы ісці хутка, але і на гэты раз яны спазніліся.
2. Сёння дакладаў не будзе ні ў вас, ні ў галоўнага аконама.
3. І неба, і зямля зліліся ў суцэльным віхры снежнага пылу і цемрадзі.
4. Паветра было празрыстае, але крыху халаднаватае.
5. Злятае з дрэў то рыжы ліст, то жоўта-залаты.

**10. Адзначце сказы, у якіх аднародныя члены сказа звязаны размеркавальнымі злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. І сама вузенькая дарожка, і прыдарожныя травы, і гэты духмяны кмен прыгадалі Лабановічу зараз ужо досыць далёкае дзяцінства.
2. У познюю восень ці ў пачатку зімы вельмі небяспечны стары мядзведзь, які яшчэ не лёг спаць на зіму.
3. Чуваць ці то птушыны шчэбет-перасвіст, ці то веснавое булькание ручаін.
4. Загоны перасякаюцца то тонкімі, то шырокімі завілінамі дарог.
5. Аднак Скарына ўсё ж паехаў туды і прапанаваў тутэйшым уладарам наладзіць друкаванне кніг.

***Варыянт 2***

1. Упалі першыя буйныя кроплі дажджу і, нібыта крупінкі жывога срэбра, пакаціліся па дарожным пыле.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Гэта былі дробныя навакольныя землеўласнікі, з якімі Лабановічу не давялося ні пазнаёміцца, ні сустрэцца потым.

3. У такі час з хаты, недалёка ад той, дзе дзяўчына брала ваду, выйшаў на ганак, пацягваючыся, хлопец з заспанымі вачыма, з калматай ці то русявай, ці то цёмнай чупрынай.

4. Вучацца птушкі лятаць строем у пэўным парадку, робяць розныя манеўры, нечаканыя крутыя павароты то ў адзін, то ў другі бок.

5. Або сёння, або заўтра на рацэ кранецца лёд.

**11. Адзначце сказы з прапушчанымі знакамі прыпынку:**

***Варыянт 1***

1. Ёсць на карце нашай Радзімы нямала такіх гарадоў, непаўторны каларыт якіх увабраў у сябе таямнічую экзотыку даўніны і мяцежны подых бітваў, і галавакружны поступ пераўтварэнняў.

2. У ясныя вясеннія або летнія раніцы ці вечары, калі паветра, напоенае вільгаццю, бывае асабліва чыстым і празрыстым, манастыр выступае яшчэ больш выразна ў сваіх магутных абрысах.

3. Гаварыў ён гладка і востра і часта выклікаў вясёлы смех сваіх слухачоў і слухачак.

4. Вясна пашыла зялёнае адзенне і лесу і лугу, і саду.

5. Чалавек не можа існаваць без прыроды, як не можа існаваць без паветра, вады і ежы без святла і цяпла.

***Варыянт 2***

1. Вецер, мусіць, недзе заблудзіўся ці, нагуляўшыся ўчора, стомлена заснуў дзе-небудзь у старой пушчы.

2. Жыццё першадрукара было напоўнена падарожжамі, узлётамі да вяршынь славы і горкімі расчараваннямі.

3. Колерам і пахам, і смакам чаруе гэта ягада.

4. І месяц і зоркі, і неба любаваліся возерам, глядзелі ў яго, нібы ў люстэрка.

5. Калі б сягоння давялося мне яшчэ раз прайсціся па тых дарогах, дык я і не пазнаў бы ні тых дарог ні мясцін, ні малюнкаў, што разгортваліся перад вачыма паўвека таму назад.

**12. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Буслы збіраліся ў чароды і доўга стаялі на грудах, або лянiва аглядалі лагчыны.

2. Васіль быў рыбак, не толькі заўзяты, але наваг, як кажуць, заядлы.

3. Стары Даніла замяніў Сымонку дзеда, і бацьку, і маці.

4. Страшэнныя валы вады пабеглі на зямлю і злізвалі хаты і лясы.

5. У вала доўгі язык, ды гаварыць не можа.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Я іду, то збочваючы з дарогі, то зноў вяртаючыся на яе.

2. Над тайгою плыве ці то дым, ці то смуга.

3. Вёска знаходзілася за лапікам малодога, яловага лесу.

4. Глыбокае мора, і ясныя высі, і воблакі ў небе, і ўсплёскі вады насустрач плывуць.

5. Звонкая песня жаваранка клалася на душу, ды абяцала радасны дзень.

**13. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:**

***Варыянт 1***

1. Аздоблены былі кніга золатам, і срэбрам, і ўсімі зямнымі і нябеснымі колерамі.

2. Адшумела лета вясёлымі, птушынымі галасамі.

3. Дарога, то віляла з пагорка на пагорак, то вілася між стромкіх сосен.

4. Корміцца мядзведзь ягадамі чарніц і брусніц, суніц і малін крушыны і каліны.

5. Набягае ветрык аднекуль ажно з-пад далёкага сіняга лесу, завівае чупрыны густому высокаму жыту, блукае па полі, калыша ад краю да краю буйное, туга набітае зернем калоссе.

***Варыянт 2***

1. Вясна пашыла зялёнае адзенне полю, і лесу, і лугу, і саду.

2. Малады бярозавы гай шчыльнай сцяной стаяў уздоўж ракі.

3. Мне роўных бальшакоў не выбіраць, ні восенню, ні летам, ні зімой.

4. Радасныя песні салаўёў то зліваюцца ў адну звонкую мелодыю то раптам разыходзяцца.

5. Пахла ў гэтым двары і мятай і свежай сасной, і ліпавай квеценню.

**14. Адзначце сказы, у які на месцы пропуску ставіцца працяжнік:**

***Варыянт 1***

1. Гнёзды былі ўсюды _ ў дуплах і на галінах дрэў, у хмызняках і на купінах.

2. І прыгожыя вочы, і тонкія бровы, і густыя валасы _ ўсё гаварыла аб жаночай красе.

3. Аднастайныя нудныя дажджы, сцюдзёныя вятры, цёплае сонца _ ўсё бачыла гэты востраў заклапочаным, у няспыннай штодзённай руплівасці.

4. Летняя ноч, туман над возерам, мігценне зор _ усё гэта дыхала ласкай і спагадаю.

5. Калі весці гаворку пра вужа, то жыве ён усюды _ ў лесе, на балоце, у хмызняках, на берагах азёраў і рэк і нават, здараецца, у блізкім суседстве з людзьмі.

***Варыянт 2***

1. І гэты ясны дзень, і краявіды, поўныя паэзіі, і гэтыя звесткі аб новым месцы _ ўсё ўзмацняла добры настрой настаўніка.

2. І луг, і поле, і горкі _ ўсё засыпана белым халодным пухам.

3. Гандляры на ўсе галасы расхвальвалі свой тавар _ іголкі, ніткі, іншую дробязь.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. І бальшак, і лес _ усё спавіта душнаю зялёнаю смугой.
5. Паспяваюць розныя ягады _ суніцы, чарніцы, маліны, парэчкі.

**15. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца двукроп'е:**

***Варыянт 1***

1. Толькі тут Алесь адчуваў сябе лепей, бо ўсё вакол было знаёмае _ дрэвы, трава ля іхніх каранёў, жвір пад нагамі.
2. На шыбе ўсё _ краскі, чараты, траў нямала.
3. Чалавек арганічна і непарыўна звязаны _ з прыродай з лясамі, палямі, гарамі, стэпамі і пустынямі, з морамі, рэкамі і балотамі, звярамі, птушкамі і рыбамі.
4. Новае месца, новыя людзі і работа ў школе, якую трэба было распачынаць на гэтых днях, усё гэта займала яго думкі.
5. Кларын трэнер, нейкія незнаёмыя хлопцы і дзяўчаты, відаць, таксама спартсмены _ ўсе госці былі чужыя.

***Варыянт 2***

1. Людзі заўсёды былі чым-небудзь заняты _ ўранку і ўвечары, летам і зімой, у хаце, на двары, у полі, на балоце, у лесе.
2. На ўзлеску мора кветак _ бэзава-блакітных і блакітна-ліловых, цёмна-фіялетавых і светла-ружовых.
3. І ў бедную мужыцкую хатку, і на пясчаную горку, і ў лагчынку, і ў лес, і на луг _ усюды загляне сонейка.
4. Мядзведзь нападае часам, калі не хапае мяса, _ на лася, дзіка, казулю, а таксама на хатнюю жывёлу кароў, коней, свіней, авечак.
5. Чарцёж, дамашняе сачыненне _ ўсё гэта Клары трэба было зрабіць.

**16. Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць і двукроп'е, і працяжнік:**

***Варыянт 1***

1. Усё і смех, і боль, і шчасце, і трывогі былі ў жыцці.
2. Нават на невялікім участку тут мона сустрэць каля паўсотні парод лесу сасна, елка, дуб, бяроза,клён, ліпа, алешына…
3. У яе ўсё было прыгожае смуглявы твар, пастава, сінія вочы, доўгая каса ўсё тое, што не купіш ні за якія грошы.
4. У лесе, у полі, на лузе ўсюды адчуваўся подых восені.
5. Усё гамонка вятроў, абрысы скалы таямнічай, і зоры, і мора хвалюе мяне.

***Варыянт 2***

1. Снег роўнаю плёнкаю кладзецца ўсюды на хаты, на гумны, на платы.
2. У гэты час на лясных палянках і ўскраінах ужо можна сустрэць першыя веснавыя кветкі блакітныя пралескі, сон-траву, кураслеп.
3. Усё на лузе кусты, лужы, копы, пракосы таксама ружавела.
4. Павеяў ветрык – і ўсё брук, руіны, сцены і дахі дамоў стала нібы чысцейшым.
5. Усё і начная казачная паляна, і растрывожаны лес, і абуджаная рака ўдзельнічала ў старажытным купальскім свяце.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАЦЯЖНІК ПАМІЖ ДЗЕЙНІКАМ І ВЫКАЗНІКАМ

1. Знайдзіце дзейнік і выказнік.
2. Вызначце спосабы іх выражэння:

| назоўнік<br>назоўнік | | назоўнік<br>інфінітыў | інфінітыў<br>назоўнік | інфінітыў<br>інфінітыў | назоўнік<br>лічэбнік | лічэбнік<br>лічэбнік | займеннік<br>назоўнік | назоўнік<br>фразеалагізм |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| працяжнік ставіцца | працяжнік не ставіцца | працяжнік ставіцца | працяжнік ставіцца | працяжнік ставіцца | працяжнік ставіцца | працяжнік ставіцца | працяжнік не ставіцца | працяжнік ставіцца |
| *Чалавек – частка прыроды.* | **1. перад назоўнікам-выказнікам – часціца не:**<br>*Воўк не пастух.*<br>**2. ёсць пабочнае слова**<br>*Віктар **відаць** доктар добры.*<br>**3. ёсць параўнальны злучнік:**<br>*Бярозкі* **як** *нявесты.* | *Наш абавязак – зберагчы сваю гісторыю.* | *Знайсці сваё месца ў жыцці – вялікая справа.* | *Жыць – Радзіме служыць.* | *Плошча поля – тры гектары.* | *Тры ды пяць – восем.* | *У лесе я жаданы госць.* | *Вольга – хоць замуж выдавай.* |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Заданне 1**

**Адзначце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам абавязкова ставіцца працяжнік:**

1. Прырода  найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачыма кожнага з нас.
2. Чужое ўзяць сваё згубіць.
3. Анютка вачэй не адвесці.
4. Маўчанне, гавораць, знак згоды.
5. Мой лес, ты мой сапраўдны родны дом.

**Ход разважання:**

1 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *прырода*, выказнік выражаны назоўнікам *кніга*, паміж імі ставіцца працяжнік.

2 сказ. Дзейнік выражаны інфінітывам *узяць*, выказнік выражаны інфінітывам *згубіць*. Працяжнік ставіцца.

3 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *Анютка*, выказнік выражаны фразеалагізмам *вачэй не адвесці*. Працяжнік ставіцца.

4 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *маўчанне*, выказнік выражаны назоўнікам *знак*. Працяжнік не ставіцца, таму што паміж дзейнікам і выказнікам стаіць пабочнае слова *гавораць*.

5 сказ. Дзейнік выражаны займеннікам *ты*, выказнік выражаны назоўнікам *дом*. Працяжнік не ставіцца.

**Адказ:** 1, 2, 3

**Заданне 2**

**Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам:**

1. Гусь свінні не таварыш.
2. Надвор'е сёння – ціхае, цёплае.
3. Найлепшы доктар чалавеку час.
4. Явар – экзатычнае для беларускай зямлі дрэва.
5. Кроплі дажджу – нібы гарошыны.

**Ход разважання:**

1 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *гусь*, выказнік выражаны назоўнікам *таварыш*. Працяжнік не ставіцца, таму што парад выказнікам стаіць часціца *не*.

2 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *надвор'е*, выказнік выражаны прыметнікамі *ціхае*, *цёплае*, таму працяжнік не ставіцца.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *час*, выказнік выражаны назоўнікам *доктар*. Працяжнік не ставіцца, таму што выказнік стаіць перад дзейнікам.

4 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *явар*, выказнік выражаны назоўнікам *дрэва*. Працяжнік ставіцца.

5 сказ. Дзейнік выражаны назоўнікам *кроплі*, выказнік выражаны назоўнікам *гарошыны*. Працяжнік не ставіцца, таму што перад выказнікам ёсць слова *нібы*.

**Адказ:** 1, 3, 4

**1. Адзначце сказы, у якіх на месцы прапускаў абавязкова ставіцца працяжнік:**

***Варыянт 1***

1. Лясная цішыня_ падманлівая.
2. Вясна_ не час для гутарак.
3. Бацькоў слухаць_ не знаць гора.
4. Жаваранак _птушка асцярожная.
5. Боты ў Ігната_ што трэба.

***Варыянт 2***

1. У час касьбы кашуля _хоць выкручвай.
2. У звычайных, нармальных умовах, асабліва улетку,мядзведзь _звер не злаславы, а нават лагодны.
3. Духмяны ліпень, ты_ месяц майго нараджэння.
4 .Кветкі_ як свечкі: яны таксама дагараюць.
5. Поле араць _не рукамі махаць.

**2. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў працяжнік не ставіцца:**

***Варыянт 1***

1. Найбольшая глыбіня Нарачы_ пяцьдзесят метраў.
2. Дзень_ снежны, палескі, шырокі.
3. Памятаць свой народ _не быць сіратой.
4. Ластаўка, бясспрэчна,_ птушка разумная.
5. Не сейце, людзі, зло, бо зло_ нібы асот, які ўчэпіста ўпіваецца ў душу і ўсё найлепшае ў ёй глушыць.

***Варыянт 2***

1. Выдатны доктар_ мая сястра Вольга.
2. Мой мілы салоўка, ты_ майстар на спевы.
3. Сон_ не сон для мяне, калі ён кароткі.
4. Быць незайздросным _не мець лішняга клопату.
5. Ажыны _ягады, якія за сябе пастаяць умеюць.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**3. Адзначце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам абавязкова ставіцца працяжнік:**

***Варыянт 1***

1. Зямля мая азёрная, ты казка самая прыгожая.
2. Асенні лес як мудры лекар.
3. Беларускае Палессе  моцна забалочаная нізіна, частка вялікага прыроднага рэгіёна.
4. Улетку пасёлак  хоць бокам каціся.
5. Любіць  значыць змагацца за лепшае заўтра.

***Варыянт 2***

1. Выйсці замуж не дожджык перачакаць.
2. Ноч не дзень, нават калі яна белая.
3. Любіць родную зямлю гэта значыць ведаць, адчуваць у штодзённым жыцці, спазнаваць самому і перадаваць свае веды і вопыт іншым.
4. Сумленне, паверце, самы вялікі начальнік над чалавекам.
5. Грыбы дзеці навальніц і шчодрых праліўных дажджоў.

**4. Адзначце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам працяжнік не ставіцца:**

***Варыянт 1***

1. Дні пагодлівыя, сухія.
2. Парада не здрада: часам і разумнага трэба перасцерагчы.
3. Плечы  хоць аглоблі гні.
4. Зрабіць эскіз, відаць, простая для вас справа.
5. Малінаўка гэта птушка невялікая, у шэра-аліўкавым убранні, з аранжава-чырвоным фартушком на грудках.

***Варыянт 2***

1. З сярэдзіны сямнаццатага стагоддзя Белавежская пушча адзінае месца ў Еўропе, дзе вадзіліся зубры.
2. І любіш ты, як ён, як я, жанчыну ў строгім плацці, яна настаўніца твая, твая другая маці.
3. Вясёлка не дзіва пасля навальніцы, пасля веснавога дажджу, бліскавіцы.
4. Біяграфія, можна сказаць, гісторыя чалавека.
5. Знайсці сваё месца ў жыцці  вялікая справа.

**5. Адзначце сказы з прапушчанымі знакамі прыпынку:**

***Варыянт 1***

1. Берагі рэчкі вельмі крутыя і высокія.
2. Хваліць сябе  не мець магчымасці пачуць пахвалу.
3. Разлукі, сустрэчы як будні і святы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Верасень гэта ростані на вечных дарогах старога і новага жыцця.
5. Жыць гэта піць крынічную ваду і ўмывацца росамі.

***Варыянт 2***

1. Прырода і чалавек  дзве культуры на планеце Зямля.
2. Колас адзін у адзін.
3. Сяброўства, безумоўна, найдаражэйшы дар.
4. Экзамены не свята, а адказная справа.
5. Пракос весці  не вуліцу месці.

**6. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Кожны з нас адказны за лес краіны.
2. Сёння дождж – нібы сярэбраны гарох.
3. Шчасце не конь: уаглоблі не ўпражэш і не паедзеш.
4. Жыццё пражыць – не поле перайсці.
5. Найбольшая глыбіня Свіцязі пятнаццаць метраў.

***Варыянт 2***

1. Нівы вокам не абняць.
2. Сябры лесу ведаюць, што кажаны – надзвычай карысныя жывёлы.
3. Цікавы субяседнік – дзядзька Васіль.
4. Чаромхавая бель як цёплы снег.
5. Жыць праўдзіва і·сумленна – бацькоўскай мудрасці ўрок.

**7. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:**

***Варыянт 1***

1. Свіцязь – ціхае, ласкавае возера, што так утульна лягло паміж задуменнага лесу.
2. Раніца – не раніца, а цуд.
3. Явар, безумоўна, – незвычайнае дрэва.
4. Жыццё пражыць не песеньку спець.
5. Алешына – верны прадказальнік вады.

***Варыянт 2***

1. Пісаць пра мінулае не крочыць назад.
2. Даволі рэдкая ў Беларусі – птушка шчур.
3. Віктар Мікалаевіч, відаць, доктар добры.
4. Спёка хоць гвалт крычы.
5. Шоўкаўская дуброва – помнік беларускай прыроды.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПАБОЧНЫЯ СЛОВЫ І СЛОВАЗЛУЧЭННІ. ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКАЗАХ З ПАБОЧНЫМІ КАНСТРУКЦЫЯМІ

Пабочныя словы і словазлучэнні на пісьме заўсёды выдзяляюцца коскамі.

| Значэнне | Пабочныя словы і спалучэнні слоў |
|---|---|
| Розная ступень упэўненасці | ***Вядома, магчыма, безумоўна, канечне, можа,сапраўды*** і інш. |
| Розныя пачуцці, эмоцыі | ***На жаль, на шчасце, на радасць*** і інш. |
| Крыніца паведамлення | ***На маю думку, па-мойму, як кажуць, як паведамляе*** і інш. |
| Парадак думак і іх сувязь | ***Такім чынам, наадварот, па-першае, значыць*** і інш. |
| Заўвагі аб спосабах афармлення думак | ***Можна сказаць, адным словам, інакш кажучы*** і інш. |

| Слова | З'яўляецца пабочным | Не з'яўляецца пабочным |
|---|---|---|
| ***Аднак*** | У сярэдзіне сказа | У пачатку сказа |
| ***Напэўна, канечне*** | У значэнні *"відаць"*, *"магчыма"* | У значэнні *"абавязкова"*, *"безумоўна"* |
| ***Нарэшце*** | Паказвае на сувязь думак, парадак выказвання | У значэнні *"пасля ўсяго"*, *"пад канец"*, *"напаследак"* |
| ***Бадай*** | У значэнні *"магчыма"* | У значэнні *"амаль"* |

Словы ***нават***, ***таксама*** і спалучэнне ***на першы погляд*** ніколі не бываюць пабочнымі.

### Заданне

**Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:**

1. Госці ўсе былі чужыя: Кларын трэнер, нейкія незнаёмыя хлопцы і дзяўчаты_ відаць_ таксама спартсмены.
2. Паводле легенды_ назва мясцовасці нарадзілася ад вязаў, якія і цяпер упрыгожваюць берагі рэчкі.
3. Аднак_ дарогу праз лес праехалі непрыкметна.
4. Рака з гэтага месца_ здавалася_ вузенькаю стужкаю.
5. Нават у лесе ўсё здранцвела, заснула да вясны.

### Ход разважання:

1 сказ. Слова *відаць* з'яўляецца пабочным, выражае няўпэўненасць, таму выдзяляецца коскамі.

2 сказ. Словаспалучэнне *паводле легенды* з'яўляецца пабочным, паказвае на крыніцу паведамлення, таму аддзяляецца коскамі.

3 сказ. Слова *аднак* стаіць у пачатку сказа, таму пабочным не з'яўляецца і коскай не аддзяляецца.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

<u>4 сказ.</u> Слова *здавалася* з'яўляецца выказнікам, таму коскай не выдзяляецца.

<u>5 сказ.</u> Слова *нават* ніколі пабочным не з'яўляецца, таму коскай не адздзяляецца.

**<u>Адказ:</u>** 1, 2

**1. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:**

***Варыянт 1***

1. Усё_ здавалася_ прадказвала добрую пагоду да самага вечара.
2. Зямля_ здаецца_ лёгкай, бязважкай, яна ўся дыхае цішай, спакоем.
3. Крайко дзейнічаў заўсёды_ напэўна, ён не любіў працаваць прыблізна, абы-як.
4. Відаць_ яловая шышка, незнарок скінутая вавёрачкай, так напалохала зайца.
5. Ад сустрэчы_напэўна_ запала ў душу незразумелая макавінка нейкай вінаватасці за вецер і холад на вуліцы, за маладую жанчыну, якая абмінула інваліда.

***Варыянт 2***

1. Мне была добра_ вядома_ гэта дарога, бо летам я часта хадзіў па ёй праз лес да сваёй цёткі, якая жыла ў вёсцы за два кіламетры ад нашай.
2. Вядома_ была і другая прычына, чаму мы проста не маглі жыць без подзвігаў.
3. Аднак_ Скарына ўсё ж паехаў туды і прапанаваў тутэйшым уладарам наладзіць друкаванне кніг.
4. Ён_ аднак_ адчуў, што пасля сну да яго вярнуліся ранейшыя сілы.
5. Да алешыны_ на жаль_ у любую пару года душа застаецца абыякавай.

**2. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў коскі не ставяцца:**

***Варыянт 1***

1. Вецер_ мусіць_ недзе заблудзіўся ці, нагуляўшыся ўчора, стомлена заснуў дзе-небудзь у старой пушчы.
2. Але такое становішча тут не палохала, людзям на востраве яно_ здавалася_ зусім звычайным.
3. Вераніка стаяла ў купцы аднакласніц, маўклівая і_ здавалася_ нават спалоханая.
4. На гэтым павароце рака вымывала глыбокія ямы, якія не высыхаюць_ нават_ і ў самае гарачае лета.
5. Аднак_ён не паказваў, што заўважыў гэта.

***Варыянт 2***

1. Яна_ нават_ не заўважала, што хустка з'ехала з галавы і агаліла сівыя, нібы абсыпаныя мукой, валасы.
2. Лес_ здаваўся_ калматым.
3. Толькі_ здаецца_ зямля-матухна злёгку трымае цябе за плечы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. З першага позірку_ відаць, што дубы гэтыя пасаджаны чалавекам і што клапатлівыя рукі заўсёды прысутнічалі тут.

5. Выпадкова знойдзенай спажывы мядзведзю_ відаць_ мала.

**3. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца пабочнымі:**

***Варыянт 1***

1. Хацелася мне *вядома* пачуць ад Коласа нешта незвычайнае, важнае.
2. Праз некаторы час стала *вядома*, што нехта падпаліў будынак, у якім знаходзілася нямецкая камендатура.
3. Мне здаецца, што *варта* толькі выйсці на загуменне і ўгледзецца ў бок лесу, як лазнякі прыветна паківаюць мне сваімі галінкамі.
4. Празрыстыя белыя хмаркі ледзь прыкметна плывуць і *здаецца* зусім спыняюцца над купкай бяроз.
5. *Праўда* пакрысе меншаў і гэты лужок.

***Варыянт 2***

1. Часам узнятая каса так адлюстроўвала сонца, што *здавалася*, быццам яркая маланка пранізвала яго.
2. Далёкім святлом займаўся край неба, і *навокал* сталі відаць кусты і травы.
3. Край неба над лесам густа пунсавеў, так што *здавалася* вось-вось загарыцца лес.
4. У маёй вёсцы, як *відаць* і ў кожным палескім сяле, ваколіцы падзелены самімі жыхарамі на свой уласны выбар.
5. Такая раса *кажуць* сама касу вострыць.

**4. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы не з'яўляюцца пабочнымі:**

***Варыянт 1***

1. Вунь *відаць* яшчэ тая глухая сцежачка, якой ён любіў бегаць раніцаю ў грыбы.
2. Жанчына *відаць* не паверыла, шукала ў гэтым нейкую скрытую прычыну.
3. Яны *відаць* загінулі або ад куль фашысцкіх салдат, або ў час франтавых баёў.
4. Лес заўсёды цёмны, спакойны, велічны, *нават* суровы.
5. Качар *аднак* трымаўся ад хлопчыкаў на адлегласці, не падпускаў іх блізка да сябе, гатовы ў любую хвіліну кінуцца ў гушчар.

***Варыянт 2***

1. Васіль быў рыбак не толькі заўзяты, але *нават*, як кажуць, заядлы.
2. У паўднёвай частцы горада *відаць* велізарны белы манастыр, збудаваны езуітамі ў шаснаццатым стагоддзі.
3. Чорна-бурыя астраўкі далёка *відаць* сярод белага, заснежанага поля.
4. Гняздо было не вельмі ўтульнае і прыгожае, амаль з адных карэньчыкаў сухога пырніку, але для жаваранкаў *відаць* лепшае і не трэба было, каб вывесці і выкарміць дзяцей.
5. *Вядома* Сяргей хацеў бы зноў сядзець з Наташай.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Здавалася, нічога няма на свеце, акрамя гэтага бясконцага балота і жураваў у сінім бяздонні.
2. Здаецца, яшчэ праз тыдзень на змену дажджу пасыплецца снег, ляжа на зямлю мяккім пухам.
3. Аднак, не зважаючы на розныя густы і характары, хлопцы шчыра сябравалі і адзін без аднаго доўга не маглі заставацца.
4. Цэлы дзень ён мог праседзець на рэчцы, не зважаючы ні на спёку, ні на дождж, ні ,нават, на тое, што людская рыба не бярэцца.
5. Досыць вялікі прышкольны агарод, праўда, незасеяны і запушчаны, прымыкаў да плятня казённага ляснічага.

***Варыянт 2***

1. Без жаўрукавай песні, бадай, і вясна была б не вясна.
2. Рамонкаў аднак было няшмат.
3. На выгане трава здавалася сівой, як валасы ў старога.
4. Недзе далёка быў відаць агеньчык, які даваў надзею на тое, што там, напэўна, вёска.
5. Здаецца тут сабрана ўся краса Беларусі.

**6. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:**

***Варыянт 1***

1. Лабановічу часамі здавалася, што школа адстае, што вынікі дасягнуты нязначныя.
2. Неба ,здавалася, бляклым, быццам выгаралым за ліпеньскую і жнівеньскую спёку.
3. Аднак, тут грукнулі дзверы з двара, а затым Ліда пачула мерны тупат ног у сенях.
4. Маці з некаторымі падрабязнасцямі апісала сваё адчуванне, што было незадоўга перад гэтым, і, нават, сон расказала, ідучы ў хату разам з дзядзькам Марцінам і Андрэем.
5. Праўда, такім гарачым і заўзятым Васіль быў не толькі ў рыбнай справе.

***Варыянт 2***

1. Але, нават, у неспакоі быў спакой, таму што быў вечар.
2. Лабановіч увайшоў у клас з некаторым спазненнем, мяркуючы, што можа яшчэ падыдуць вучні.
3. Зарэчная балотная роўнядзь злівалася з небам і, здавалася, не мела канца-краю.
4. Я, нібы зачараваны, глядзеў на зімовы лес, і мне, здавалася, што ў ім ёсць штосьці міфічнае.
5. Часамі ў воласць заходзілі людзі,маючы, відаць, нейкія свае патрэбы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СКАЗЫ З ПАРАЎНАЛЬНЫМІ ЗВАРОТАМІ. ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКАЗАХ З ПАРАЎНАЛЬНЫМІ ЗВАРОТАМІ

| Коска ставіцца | Коска не ставіцца |
|---|---|
| Пры параўнальных зваротах, якія пачынаюцца злучнікамі ***нібы, быццам, як быццам, як, бы,як бы, нібыта, што, як і, чым.*** | 1. Пры параўнальных зваротах перад злучнікамі ***як*** і ***чым*** у спалучэннях ***больш як (не больш як),больш чым (не больш чым), менш як (не менш як), менш чым (не менш чым), не далей як, не часцей як*** і інш.<br>2. Калі перад параўнальным зваротам ёсць часціца ***не*** або прыслоўі ***зусім, амаль.***<br>3. Калі параўнальны зварот з ***як*** мае значэнне *"ў якасці"*.<br>4. Не выдзяляюцца коскамі:<br>– іменная частка выказніка;<br>– устойлівыя выразы ***як мага, як след, відна як днём, ведаць як свае пяць пальцаў*** і інш. |

**Заданне**

**Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):**

1. Сонца прыгравала зусім_ як летам.
2. Яму хацелася_ як мага болей_ абудзіць дапытлівы розум сваіх выхаванцаў, шырэй расчыніць ім вочы на свет і навучыць іх крытычна стаавіцца да жыцця.
3. Сама чарэшня_ як і гаспадар_ адчувала надыход другой маладосці.
4. Восень_ быццам казачная лісіца з пышным вогнененным хвастом.
5. А на гэтай шалёнай маладой зеляніне_ як зорачкі на небе_ зіхацяць пяшчотныя маргарыткі.

**Ход разважання:**

1 сказ. Параўнальны зварот *як летам* коскай не аддзяляецца, таму што перад ім стаіць прыслоўе *зусім*.

2 сказ. Выраз *як мага болей* коскамі не выдзяляецца.

3 сказ. *Чарэшня* параўноўваецца з *гаспадаром*. Параўнальны зварот *як і гаспадар* коскай аддзяляецца.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4 сказ. Дзейнікам у сказе з'яўляецца слова *восень*, а слова *лісіца* – іменная частка выказніка, таму коска не ставіцца.

5 сказ. *Маргарыткі* параўноўваюцца *з зорачкамі на небе*. Параўнальны зварот *як зорачкі на небе* выдзяляецца коскамі.

**Адказ:** 3, 5

**1. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):**

***Варыянт 1***

1. Радуга_ як арка_ стаяла ў блакіце неба.
2. Вакзал_ нібы ўзрушаны вулей.
3. Чорная_ як сажа_ ноч сышла на зямлю.
4. Разгалістыя сосны_ быццам зялёныя шатры.
5. На паляне_ быццам на пасецы_ пахла мёдам.

***Варыянт 2***

1. Кожная бярозка_ што нявеста.
2. Густая трава_ як мора_ калышацца на ветры.
3. Дзянёк_ нібы залаты матылёк.
4. На беразе стала светла_ як днём.
5. Сяму-таму, як і дзядзька Ігнат, я навучыўся ў вёсцы.

**2. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў коскі не ставяцца:**

***Варыянт 1***

1. Мы ў майскі лес_ нібыта ў рай_ зайшлі.
2. Ён біўся_ як рыба аб лёд.
3. Вочы_ што спелыя вішні.
4. Як працавіты дрывасек_ гром уздыхнуў і грукнуў глуха.
5. Уладзімір Караткевіч плённа працаваў_ як празаік, паэт, драматург, публіцыст.

***Варыянт 2***

1. Мы ведаем жаўранкаў_ як вясёлых і нястомных песняроў поля.
2. Мароз_ нібы злаваўся на ўвесь свет.
3. Гонар за родную зямлю нараджаецца яшчэ ў маленстве і_ як першы вясновы парастак_ набірае сілу, крэпне на працягу ўсяго жыцця.
4. Яны пайшлі _як ні ў чым не бывала.
5. Мядзведзіца_ нібы праз сон_ узняла галаву і абнюхала лесніка.

**3. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя курсівам словы (словазлучэнні) трэба выдзеліць коскай (коскамі):**

***Варыянт 1***

1. Пагода стаіць *як па заказу.*
2. Хрыпіць вецер *нібы старая пласцінка.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Янка Брыль вядомы *як перакладчык з рускай, украінскай і польскай моў*.

4. Сонца *ўзышло як і ўчора* з-за цёмнага бору.

5. Недалёка ад школы ляжаў *нібы гіганцкі арэх* валун.

***Варыянт 2***

1. Station Сцяпанавіч мог гадзінамі стаяць і *нібы зачараваны* слухаць шолахі лесу, бо чуў у іх лясныя радасці і трывогі.

2. Аднак у летнюю пару бываюць у дзятлаў часіны, калі яны становяцца такімі ж лаўцамі насякомых *як і іншыя птушкі*.

3. Вершаваны радок *нібы каласок*.

4. Зіма *нібы злавалася на сваё спазненне*.

5. *Як і кожны год* Васілёк з Алёшам сустракалі лясных і балотных птушак.

**4. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя курсівам словы (словазлучэнні) коскамі не выдзяляюцца:**

***Варыянт 1***

1. Гайдаюцца ветрам вяршаліны дрэў, звіняць *як цымбальныя струны*.

2. Помнікі жывёлам узводзіліся ў розных краінах *як сведчанне ўдзячнасці людзей братам сваім меншым*.

3. Табе, Андрэй, бачу, гэты завод *як костка ў горле*.

4. Меднастволы бор *нібыта адчуваў і разумеў настрой маёй душы*.

5. Хмара *як чорны парасон*.

***Варыянт 2***

1. Гарыць *быццам факел* клён каля маёй хаты.

2. Куфар раней выкарыстоўвалі *як сховішча для адзення, бялізны, тканін*.

3. Птушкі *нібы гуляюць у нейкім рытмічным паветраным карагодзе*.

4. Трыццаць гадоў *як лёду* адпрацаваў Кірыл лесніком.

5. Узыходзіла сонца, хутка сушыла расу, што блішчала ранкам *як слёзы* на лісцях раслін.

**5. Адзначце сказы з прапушчанымі знакамі прыпынку:**

***Варыянт 1***

1. Усе ведаюць Янку Купалу як аўтара паэмы “Магіла льва”.

2. На краі дзялянкі як вартавы ўзвышаецца дуб.

3. Убранне кожнай птушцы прырода здолела пашыць,няхай не на ўсё жыццё адзіны, ды гарнітур як мае быць.

4. Быццам тысячы моцна нацягнутых струн танкаствольныя сосны звіняць.

5. Усё навокал як бы заззяла фарбамі вясёлкі.

***Варыянт 2***

1. У Белавежскай пушчы нібы сабраны ў некранутым выглядзе ўзоры прыроды з усёй Беларусі.

2. Усе ведалі Алесю як добрага арганізатара мерапрыемстваў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Калі падыходзіш да гнязда, жаваранак адразу не ўзлятае, а як глушэц або цяцерка адбягае ад яго і толькі тады ўзнімаецца ў паветра.

4. Мядзведзь стаяў нерухома, як вялізны пень, і пільна глядзеў на чалавека.

5. Яны беглі што ёсць сілы.

**6. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Рассыпаліся ў небе зоры, нібы сярэбраны пясок.
2. Абодвух іх ведалі, як добрых хірургаў.
3. Крэпасць ляжыць на месцы таго Бярэсця, якое ўжо ў 1019 годзе ўспамінаецца, як досыць вялікае пасяленне.
4. Выплыў месяц, круглы, поўны, падрумянены, як блін.
5. Ліду паважалі, як выдадатніцу і добрую сяброўку.

***Варыянт 2***

1. Старая кніга, як бы злучае сённяшняе з мінулым.
2. Быццам нявестамі, любуюся я белымі яблынямі.
3. Вада ў рэчцы была чыстая,празрыстая, быццам шкло.
4. Матыў роднага неба і зямлі акрэсліваўся, як вызначальны для ўсёй творчасці Б. Сачанкі.
5. Тоненька, нібы званочкі залатыя, звоняць на лузе кветкі веснавыя.

**7. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:**

***Варыянт 1***

1. Гонкае і роўнае, як струна дрэва выцягнулася ў вышыню, каб зялёнай верхавінай зірнуць на ваколіцу.
2. Калі бацька быў дома, дзеці сядзелі, як мышы пад венікам.
3. "Ктэхізіс" Сымона Буднага вядомы нам як першая друкаваная кніга на тэрыторыі Беларусі.
4. Гаспадар на жытнёвым полі з каласамі, як з дзецьмі, гутарыў.
5. Пасля дажджу ўсё здаецца, як бы абноўленым.

***Варыянт 2***

1. Вёска Мікалаеўшчына назаўсёды ўвайшла ў гісторыю, як радзіма Якуба Коласа.
2. Пялёсткі яблынькі, што сняжынкі.
3. Упалі першыя кроплі дажджу і, нібыта крупінкі жывога срэбра задрыжалі і пакаціліся па дарожным пыле.
4. Пад яблынямі быў спакуслівы цень: так і хацелася легчы на зялёную, свежую, як ранняй вясной, траву.
5. Навіна прагучала як гром з яснага неба.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

## Заданне

**Адзначце нумары сказаў: а) пэўна-асабовых; б) няпэўна-асабовых; в) абагульнена-асабовых; г) безасабовых; д) назыўных:**

1. Бяздонную бочку вадой не напоўніш.
2. Цішыня, цяплынь, спакой.
3. Прыемна слухаць песні салаўя.
4. За свабоду сваю ўсёй душой пастаю.
5. Тут займаюцца вытворчасцю шкла і тканіны.

## Ход разважання:

<u>1 сказ.</u> Выказнік *не напоўніш* абазначае дзеянне, якое адносіцца да любой асобы. Таму сказ з'яўляецца абагульнена-асабовым.

<u>2 сказ.</u> Сказ назыўны, так як *цішыня*, *цяплынь*, *спакой* – дзейнікі.

<u>3 сказ.</u> Сказ безасабовы, таму што выказнік *прыемна слухаць* выражаны спалучэннем інфінітыва і прыслоўя.

<u>4 сказ.</u> Выказнік *пастаю* выражаны дзеясловам 1-ай асобы адзіночнага ліку будучага часу. Таму сказ з'яўляецца пэўна-асабовым.

<u>5 сказ.</u> Сказ няпэўна-асабовы, таму што выказнік *займаюцца* выражаны дзеясловам 3-й асобы множнага ліку цяперашняга часу.

**<u>Адказ:</u>** а) 4; б) 5; в) 1; г) 3; д) 2.

**1. Адзначце аднасастаўныя сказы:**

***Варыянт 1***

1. Па-асенняму глуха шумелі сосны.
2. Ні душы не было відаць нідзе.
3. Адным арэхам наўрад ці падзеляцца.
4. За шыбамі змрок.
5. Вазьму шурпаты каласок на чуйным провадзе саломы.

***Варыянт 2***

1. Добра ў лузе ў час палудны.
2. Выйду на ціхі зялёны прастор і пакланюся вясне маладой.
3. Гаворка пайшла весела і лёгка.
4. Чырвоны агеньчык настойліва мільгануў яшчэ раз.
5. Калі справа не пад сілу, дык на плечы не бяры.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**2. Адзначце двухсастаўныя сказы:**

***Варыянт 1***

1. Баранілі нас дубы і сосны і прымалі разам з намі бой.
2. А часы не выбіраюць, у іх жывуць і паміраюць.
3. З нашай бульбы тысячу, не меней, смажаць і гатуюць розных страў.
4. Навокал доміка кусты бэзу.
5. Начное рэха данесла гук далёкага ўзрыву.

***Варыянт 2***

1. Паганае зелле не зрывай, а з каранем вырывай.
2. Помніш, друг, як гасцявалі ў нарачанскай старане?
3. Над намі цёмнае неба, усыпанае буйнымі зорамі.
4. Дзень лагодны, ціхі.
5. Настае ядраная раніца.

**3. Адзначце пэўна-асабовыя сказы:**

***Варыянт 1***

1. Вячэрняя задумная хвіліна.
2. Каторы дзень настрой губляю і зноў па-новаму люблю.
3. Па роснай траве шпарка крочым да ракі.
4. Не кувай ты, шэрая зязюля, сумным гукам у бары.
5. Нават снегам пацерусіла трохі зверху.

***Варыянт 2***

1. Зробім перапынак на трыццаць хвілін.
2. Месца для адпачынку выбралі надзвычай добрае.
3. Ціха ўспамінайце васілёчкі ў жыце.
4. З саду несла саладкаватым пахам падапрэлых яблык-паданак.
5. Люблю цябе, мая краіна.

**4. Адзначце няпэўна-асабовыя сказы:**

***Варыянт 1***

1. Дарогу расчышчалі, капалі канавы ў снезе.
2. Ідуць у лесе, крычаць, гукаюць, як вучні, вырваўшыся са школы.
3. Заўважаю на вадзе мноства чаек.
4. Адным ударам тапара дрэва не зваліш.
5. Паходжанне назвы Белая Русь тлумачаць па-рознаму.

***Варыянт 2***

1. Стаю ля акна ў цішы калідора.
2. Нават на вуліцах ліхтары запалілі.
3. Лескаўцу прапанавалі выступіць на сходзе першаму.
4. На сцэне танцавалі і спявалі.
5. Непраглядная асенняя ноч.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Адзначце абагульнена-асабовыя сказы:**

***Варыянт 1***

1. Рана ўстанеш – многа зробіш.
2. Добрага чалавека не перахваліш.
3. Ад самога сябе не ўцячэш.
4. Нягледзячы на позні час, у доме не спалі.
5. Хаджу па нівах, па лугах азёрных.

***Варыянт 2***

1. Калі ўлез у дугу, не кажы не магу.
2. Вучыцеся ж добра, старанна заўсёды.
3. Глыбокую ваду не замуціш.
4. Хлеб выпякаюць на лістках кляновых.
5. Свайго шчасця не абмінеш.

**6. Адзначце безасабовыя сказы:**

***Варыянт 1***

1. Яркі летні дзень.
2. У полі было ціха і пуста.
3. Збіралася на дождж.
4. Пачынала брацца на адлігу.
5. Пераначуем – болей пачуем.

***Варыянт 2***

1. Многа было сказана добрых слоў і пажаданняў.
2. Нельга жыццё растрачваць на дробязі.
3. Пасядзім перад дарогай.
4. Бяжым хутчэй на рэчку.
5. Трэба пазнаёміцца там з настаўнікам і параіцца з ім наконт розных пытанняў.

**7. Адзначце назыўныя сказы:**

***Варыянт 1***

1. Позняя восень.
2. Росны ранак.
3. У лесе цішыня і спакой.
4. Зямлі патрэбна жыта.
5. Стаіш і ловіш гукі тыя, як гімн жыццю, хвалу вясне.

***Варыянт 2***

1. Паволі займалася на дзень.
2. Вокал дома кусты бэзу.
3. Шум дажджу.
4. Бязмежнае неба.
5. Зялёнае поле.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ЛІТАРАТУРА

1. *Адамовіч Я. М., Бурак Н. І.* і інш. Беларуская мова. Сінтаксіс / Я. М. Адамовіч, Н. І. Бурак. – Мінск : Выш. шк., 1998.

2. *Клундук С. С.* Беларуская мова. Усе складаныя тэмы / С. С. Клундук, Н. Р. Якубук. – Мінск : Аверсэв, 2015.

3. *Малажай Г. М.* Беларуская мова : дапаможнік для падрыхтоўкі да абавязковага цэнтралізаванага тэсціравання / Г. М. Малажай. – Мінск : Аверсэв, 2004.

4. *Цыбульская С. І.* Беларуская мова : практычны курс падрыхтоўкі да пераказу / С. І. Цыбульская. – Мінск : ТетраСистемс, 2006.

## ЗМЕСТ

Адасобленыя акалічнасці. Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях..................3

Адасобленыя азначэнні. Знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях .......................11

Аднародныя члены сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа ..................18

Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа з абагульняльнымі словамі ...............18

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам .........................................................................27

Пабочныя словы і словазлучэнні. Знакі прыпынку ў сказах
з пабочнымі канструкцыямі ...................................................................................................32

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Знакі прыпынку ў сказах
з параўнальнымі зваротамі......................................................................................................36

Аднасастаўныя сказы ...............................................................................................................40

Літаратура ....................................................................................................................................43

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

**Старавойтава Святлана Васільеўна**

СІНТАКСІС. ПРОСТЫ СКАЗ

Практыкум

Тэхнічны рэдактар *А. Л. Пазнякоў*
Кампютарная верстка *І. Р. Куранцоў*

Падпісана ў друк 17.10.2016. Фармат 60х84/16.
Гарнітура Times New Roman. Ум.-друк. 2,56 арк.
Ул.-выд. 1,7 арк. Тыраж 42 экз. Заказ № 331

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова", 212022 Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/131 ад 03.01.2014 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі
МДУ імя А. А. Куляшова. 212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова